# Маніторынг

## выкананьня беларускімі ўладамі прапановаў эўрапейскіх структураў у сфэры нармалізацыі стану няўрадавых арганізацыяў і свабоды асацыяцыяў

**Падрыхтавана Асамблеяй няўрадавых дэмакратычных арганізацыяў Беларусі**

**Пэрыяд маніторынгу: 20.12.2008 - 28.02.2009 (прамежкавая справаздача №2)**

Паводле паведамленьня міністэрства юстыцыі, у Беларусі на 1 студзеня 2009 года існуе ў зарэгістраваным статусе 15 палітычных партыяў, 36 прафэсійных саюзаў і 2221 грамадзкае аб'яднаньне (у тым ліку 224 міжнародныя, 702 агульнанацыянальныя і 1295 мясцовыя). Такім чынам, колькасьць грамадзкіх аб'яднаньняў паменьшылася за 2008 год на 34 арганізацыі. Таксама на пачатак 2009 году існавалі ў зарэгістраваным стане 22 саюзы грамадзкіх аб'яднаньняў і 75 фондаў.

Агулам цягам 2008 года органамі юстыцыі было зарэгістравана 94 новых грамадзкіх аб'яднаньня (у пераважнай большасьці мясцовага ўзроўню), 14 новых фондаў, 3 новых саюзы грамадзкіх аб'яднаньняў. Цягам 2008 году было зарэгістравана і пастаўлена на ўлік 28 новых арганізацыйных структураў палітычных партыяў, 1297 арганізацыйныя структуры прафсаюзаў, 10017 арганізацыйныя структуры грамадзкіх аб'яднаньняў. У цэлым гэтыя паказчыкі адпавядаюць колькасьці няўрадавых арганізацыяў, партыяў і арганізацыйных структураў, што рэгістравалася ў 2007 годзе, але перавышаюць паказьнікі 2006 і 2005 гадоў.

Акрамя таго, некаторая частка няўрадавых арганізацыяў існуе ў форме ўстановаў, на якія распаўсюджваецца парадак рэгістрацыі камэрцыйных арганізацыяў, што быў уведзены напачатку 2008 года і ўдасканалены дэкрэтам прэзыдэнта №1 ад 16 студзеня 2009 года. На дадзены момант парадак рэгістрацыі гэтай формы некамэрцыйных арганізацыяў набліжаны да заяўляльнага (патрабуецца мінімальны пералік дакумэнтаў, не патрабуецца дакумэнтаў у пацьвярджэньне юрыдычнага адрасу, працэс рэгістрацыі займае некалькі дзён і ў абсалютнай большасьці выпадкаў завяршаецца атрыманьнем легальнага статуса). Згодна з паведамленьнямі, у лютым 2009 года арганізацыйна-прававая форма ўстановы зрабілася надзвычай папулярная сярод тых некамэрцыйных арганізацыяў, якія не могуць зарэгістравацца ў звыклых формах грамадзкага аб'яднаньня альбо фонда.

### 1. Крымінальная адказнасьць за дзйнасьць незарэгістраваных аб'яднаньняў

19 лютага было вынесенае папярэджаньне з боку пракуратуры аб магчымым прыцягненьні да адказнасьці па артыкуле 193-1 Крымінальнага кодэкса на адрас старшыні Баранавіцкага аддзяленьня Саюзу палякаў Тэрэзы Селівончык . Паводле сябра галоўнай рады Саюзу Палякаў Анджэя Пачобута, гэта першы выпадак, калі ўлады вырашылі выкарыстаць сумнавядомы артыкул 193-1 Крымінальнага кодэкса ў дачыненні да сяброў польскага аб'яднаньня. Як сцвярджае Анджэй Пачобут, адначасова на тэрыторыі ўсёй краіны распачаўся непрыхаваны ціск на актывістаў Саюзу палякаў з мэтай прымусіць іх адмовіцца ад удзелу ў дзейнасьці арганізацыі. Людзей запрашаюць на размовы ў КДБ, МВД ці пракуратуру, дзе адкрыта кажуць пра крымінальны перасьлед у выпадку ўдзелу ў заплянаваным на 14-15 сакавіка зьездзе арганізацыі.

### 2. Рэгістрацыя аб'яднаньняў

Рэгістрацыя напрыканцы 2008 года Праваабаронча-асьветніцкага грамадзкага аб'яднаньня "Рух за Свабоду" сталася штуршком да актывізацыі спробаў атрымаць рэгістрацыю і легальны статус для некаторай колькасьці грамадзкіх аб'яднаньняў. Вядома, што за студзень-люты 2009 года ў міністэрства юстыцыі за атрыманьнем рэгістрацыі ў якасьці агульнанацыянальнага грамадзкага аб'яднаньня зьвярнуліся больш за 10 групаў грамадзянаў. У лютым міністэрствам юстыцыі было зарэгістраванае Рэспубліканскае грамадзкае аб'яднаньне "Ліга творчае моладзі". Яшчэ большая колькасьць заявак на рэгістрацыю была пададзеная ў гэты пэрыяд на лякальным узроўні.

7 лютага адбыўся ўстаноўчы сход Асацыяцыі "Асамблея няўрадавых дэмакратычных аб'яднаньняў", 27 лютага адбыўся ўстаноўчы сход магілёўскага маладзёжнага грамадзкага аб'яднаньня "Цэнтр маладзёвых ініцыятываў "Модэс", 28 лютага адбыўся ўстаноўчы зьезд партыі Беларуская хрысціянская дэмакратыя. Таксама ў лютым былі зьдзейсьненыя спробы рэгістрацыі Грамадскага культурна-асьветніцкага аб'яднаньня "Спадчына" (горад Бярозаўка Гарадзенскай вобласьці) і іншых аб'яднаньняў.

Цягам студзеня-лютага 2009 года былі пададзеныя дакумэнты на рэгістрацыю Праваабарончага грамадзкага аб'яднаньня "Наша Вясна" (агульнанацыянальная арганізацыя) і Берасьцейскага праваабарончага грамадзкага аб'яднаньня "Брэсцкая вясна" (мясцовая арганізацыя). Абедзьве гэтыя арганізацыі створаныя заснавальнікамі ранейшага Праваабарончага цэнтру "Вясна", які быў двойчы ліквідаваны ў 1999 і 2003 годзе, якому было адмоўлена ў рэгістрацыі ў 2007 годзе і ў дачыненьні да якога існуе рашэньне Камітэту ААН па правах чалавека аб прызнаньні факту парушэньня свабоды асацыяцыяў з боку беларускіх уладаў.

Па справе рэгістрацыі аб'яднаньня "Наша Вясна" міністэрства юстыцыі ня вынесла рашэньня ў вызначаны законам месячны тэрмін: на момант 28 лютага рашэньне па гэтай справе невядомае, нягледзячы на тое, што дакумэнты былі пададзеныя ў міністэрства яшчэ 26 студзеня. Дакумэнты па рэгістрацыі "Нашай Вясны" даручана разглядаць чыноўніку міністэрства юстыцыі Аляксандру Харытону, які спрычыніўся да масавай ліквідацыі ў Беларусі грамадзкіх арганізацыяў, за што, разам з найбольш адыёзнымі асобамі беларускага дзяржаўнага істэблішмэнту стаў неўязной пэрсонаю на тэрыторыю Эўразьвязу (аднак у 2008 годзе візавая забарона супраць гэтай асобы была скасаваная Эўразьвязам).

Па справе аб рэгістрацыі аб'яднаньня "Брэсцкая Вясна" упраўленьнем юстыцыі берасьцейскага аблвыканкама было прынята рашэньне аб адмове ў рэгістрацыі.

Пасьля ўваходу прадпрыемства "Палімір" у вытворчае аб"яднаньне "Нафтан" (горад Наваполацк Віцебскай вобласьці) Незалежны прафсаюз падаў дакумэнты на перарэгістрацыю свайго статусу. Але гарадзкія ўлады адмаўляюцца прызнаць, што недзяржаўны прафсаюз цяпер таксама стаў агульнай арганізацыяй.

Прайшлі дзяржаўную перарэгістрацыю шэсьць зь сямі рэлігійных абшчын Міжнароднага таварыства сьвядомасці Крышны, якія дзейнічаюць у Беларусі. На дадзены момант ня мае посьпеху ў справе рэгістрацыі толькі абшчына горада Бабруйску (Магілёўская вобласьць).

Напрыканцы 2008 году ў Вярхоўным судзе Беларусі знаходзіліся на разглядзе, прынамсі, дзьве справы па скаргах на рашэньні Міністэрства юстыцыі аб адмове ў рэгістрацыі грамадзкіх аб'яднаньняў: Сацыяльна-экалягічнага грамадзкага аб'яднаньня "Цэнтр падтрымкі чарнобыльскіх ініцыятываў" і Сацыяльна-патрыятычнага грамадзкага аб'яднаньня "Гарызанталь". У абодвух выпадках судовыя справы зацягваліся з-за патрабаваньня органаў юстыцыі правесьці графалагічную экспэртызу подпісаў некаторых заснавальнікаў арганізацыяў, нягледзячы на тое, што гэтыя асобы зьявіліся ў суд і пацьвердзілі сваё жаданьне ўдзельнічаць у стварэньні гэтых грамадзкіх аб'яднаньняў. Пры гэтым па справе СЭГА "Цэнтр падтрымкі чарнобыльскіх ініцыятываў" Вярхоўны суд, нават, прызначыў паўторную экспэртызу, нягледзячы на тое, што першасная не пацьвердзіла несапраўднасьці подпісаў заснавальнікаў у пададзеных на рэгістрацыю дакумэнтах. Працэс рэгістрацыі гэтай арганізацыі цягнецца зь вясны 2008 году, а працэдура абскарджаньня ў Вярхоўным судзе стварае адчуваньне наўмыснага зацягваньня працэсу прадстаўнікамі міністэрства юстыцыі пры прыхільным стаўленьні да такога зацягваньня з боку суда. Верагодна, гэтая валакіта па справах СПГА "Гарызанталь" і СЭГА "Цэнтр падтрымкі чарнобыльскіх ініцыятыў" зьвязана з нежаданьнем выносіць канчатковую адмову ў рэгістрацыі ў пэрыяд шасьцімесячнага прыпыненьня санкцыяў з боку Эўразьвязу.

20 студзеня мясцовымі ўладамі горада Баранавічы (Берасьцейская вобласьць) было адмоўлена ў пастаноўцы на ўлік баранавіцкай філіі ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў". У лютым улады горада Магілёва прынялі рашэньне прадаставіць памяшканьне для магілёўскага абласнога аддзяленьня Партыі БНФ, што адчыняе магчымасьць рэгістрацыі гэтай арганізацыйнай структуры.

У сакавіку мае намер правесьці новы ўстаноўчы сход Партыя працы, якая была ліквідаваная ў 2004 годзе. У красавіку свой новы ўстаноўчы сход правядзе Партыя свабоды і прагрэсу, якой апошнімі гадамі тройчы адмаўлялі ў рэгістрацыі. Зарэгістраваная ў Чэхіі арганізацыя "Малады фронт" таксама мае намер працягнуць спробы зарэгістравацца ў Беларусі - гэта будзе пятая спроба рэгістрацыі аб'яднаньня. Праўда, на гэты раз у новым фармаце - найперш будуць рэгістравацца асобныя гарадзкія філіі "Маладога фронту" (падрабязьней глядзіце пункт 5 гэтай справаздачы).

## 3. Папярэджаньні , праверкі і іншыя санкцыіі

6 студзеня 2009 году было вынесена пісьмовае папярэджаньне Рэспубліканскаму грамадзкаму аб'яднаньню "Беларускі ПЭН-цэнтар". Падставай для вынясеньня папярэджаньня сталіся вынікі праверкі дзейнасьці грамадзкага аб'яднаньня, праведзенай нягледзячы на абвешачны ўладамі ў канцы 2008 года шасцімесячны мараторый на правядзеньне праверак. Арганізацыю абвінавацілі ў адсутнасьці юрыдычнага адраса, нягледзячы на наяўнасьць дзейснай дамовы арэнды памяшканьня, а таксама ў парушэньні правілаў справаводства, вядзеньні несанкцыянаванай перапіскі праз электронную пошту, а таксама ў неправамернай абароне сваіх сябраў (у сувязі з заявамі пратэсту, які арганізацыя выказвала з нагоды канфіскацыі на беларуска-польскай мытні зарэгістраванага часопіса АРХЭ у якасьці быццам бы экстрэмісцкага выданьня).

У лютым Гомельскае абласное ўпраўленьне юстыцыі вынесла папярэджаньне маладзёвай краязнаўчай грамадзкай арганізацыі "Талака", якая існуе ў рэгіёне звыш дзесяці гадоў. У загадзе начальніка ўпраўленьня Віталя Макарэвіча сказана, што пісьмовае папярэджаньне вынесена за выкарыстаньне незарэгістраванай сымболікі на сваім сайце і ў абвестках, якія грамадзкая арганізацыя распаўсюджвала ў абласным цэнтры. Самі ўдзельнікі аб'яднаньня лічаць, што папярэджаньне хутчэй за ўсё зьвязанае з падвышэньнем актыўнасьці грамадзкай арганізацыі ў апошні час.

Згодна з паведамленьнямі сябраў Грамадзкага аб'яднаньня "Таварыства беларускай школы", пасьля правядзеньня гэтай арганізацыяй напрыканцы 2008 году шэрагу мерапрыемстваў у сярэдніх школах, на сябраў і кіраўнікоў гэтай арганізацыі, што працуюць выкладчыкамі, аказваўся ціск з боку іх наймальнікаў.

Згодна з паведамленьнем міністэрства юстыцыі, у 2008 годзе праз суд былі ліквідаваныя 28 грамадзкіх аб'яднаньняў, а некаторыя арганізацыі самастойна прымалі рашэньні аб ліквідацыі. Таксама паведамлялася, што за 2008 год міністэрствам юстыцыі было вынесенае толькі адно пісьмовае папярэджаньне на адрас палітычнай партыі, што значна меней за колькасьць папярэджаньняў, што выносіліся партыям у папярэднія гады.

## 4. Выкананьні рэкамэндацыяў Камітэта ААН па правах чалавека

Суддзя суда Ленінскага раёна г. Менска Т.В. Жулкоўская адмовіла ўзбудзіць справу па скарзе Віктара Карняенкі супраць Міністэрства замежных справаў. Размова ідзе аб аднаўленні дзейнасьці Гомельскага абласнога грамадскага аб'яднання "Грамадзянскія ініцыятывы" у адпаведнасьці з рашэньнем Камітэта ААН па правах чалавека. Міністэрства замежных справаў, якое абавязана сачыць за выкананьнем Беларусьсю міжнародных дамоваў, павінна было адказаць у судзе, чаму арганізацыя усё яшчэ пад забаронай.

## 5. Доступ да памяшканьняў

Напачатку лютага грамадзкае аб'яднаньне "За эўрапэйскую мастоўшчыну" (горад Масты Гарадзенскай вобласьці) ня здолела знайсьці юрыдычны адрас у адміністратыўным будынку, што зьяўляецца непераадольнай перашкодай для рэгістрацыі аб'яднаньня. Мастоўскі райвыканкам адмовіў Алесю Зарэмбюку ў прадастаўленні юрыдычнай адрэсы для рэгістрацыі грамадзкай арганізацыі, спаслаўшыся на адсутнасьць свабодных для разьмяшчэньня арганізацыі памяшканьняў.

У лютым ўлады горада Мазыр (Гомельская вобласьць) адмовіліся садзейнічаць у пошуку юрыдычнага адраса для Маладога Фронту, матывуючы гэта забаронай закона ўмешвацца ў дзейнасьць грамадзкіх арганізацыяў. 6 лютага заснавальнікі арганізацыі зьвярнуліся да ўладаў з просьбай паспрыяць пошуку памяшканьня для правядзеньня ўстаноўчага сходу і пошуку юрыдычнага адрасу, без якога рэгістрацыя грамадзкага аб'яднаньня немагчымая. Як сьведчаць ініцыятары стварэньня арганізацыі, патрабаваньне мець юрыдычны адрас для грамадзкай арганізацыі зьяўляецца адной з сур'ёзных перашкодаў на шляху іх стварэньня, паколькі мясцовыя ўлады практыкуюць ціск на арэндадаўцаў, якія наважваюцца заключаць падобныя дамовы. Агулам больш, чым у 30 гарадах па Беларусі былі пададзены заявы мясцовых аддзяленьняў "Маладога Фронта" ў мясцовыя выканкамы з патрабаваньнем прадставіць памяшканьні для правядзеньня установчых сходаў, неабходных для рэгістрацый мясцовых суполак "Маладога Фронту" і забясьпечыць юрыдычныя адрэсы.

18 лютага Тарыства аховы помнікаў было вымушанае пакінуць памяшканьне ў цэнтры Менску, якое арганізацыя займала больш за дваццаць год. Гэты будынак быў адроджаны ў 1980-я гады на сродкі аб'яднаньня і належаў яму. У 2004 годзе дзяржава нацыяналізавала будынак, потым зрабіла былога інвэстара арандатарам, а ў канцы 2008 году канчаткова выселіла адтуль таварыства. Старшыня таварыства лічыць, што тэрміновасьць патрабаваньняў аб высяленьні выклікана найперш дзейнасьцю аб`яднаньня па выкрыцьці і абнародваньні фактаў парушэньня заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны і яго жорсткай пазыцыяй у гэтай справе.

## 6. Перашкоды ў правядзеньні ўстаноўчых сходаў і іншых мерапрыемстваў

Заснавальнікі Партыі Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя сутыкнуліся з цяжкасьцямі ў пошуку памяшканьня ў Менску для правядзеньня ўстаноўчага сходу 28 лютага: уладальнікі дзесяці памяшканьняў належнай ўмяшчальнасьці адмаўлялі ў прадстаўленьні памяшканьняў па палітычных матывах (адмоўныя адказы прыйшлі зь Міжнароднага адукацыйнага цэнтру IBB, Моладзевага тэатру эстрады, кінатэатраў "Аўрора" і "Цэнтральны", Цэнтральнага Дому афіцэраў, палацаў культуры чыгуначнікаў, МАЗ, МТЗ, "Сукно" і Палацу Рэспублікі.). Пасьля таго, як заснавальнікі новай партыі выказалі намер правесьці ўстаноўчы сход пад адкрытым небам у цэнтры Менска, памяшканьне для зьезду было выдзеленае ўладамі. Аднак пры гэтым мясцовыя ўлады ў рэгіёнах Беларусі працягвалі чыніць перашкоды у правядзеньні лякальных сходаў сябраў гэтай партыі, неабходных для абраньня дэлегатаў на зьезд у Менску (усяго пад час падрыхтоўкі зьезду адбылося 63 сходы для вылучэньня дэлегатаў). Таксама асобным дэлегатам гэтага зьезду пагражалі звальненьнем з працы і вучобы, калі яны прымуць удзел ва ўстаноўчым зьездзе новай партыі. 28 лютага, у дзень правядзеньня з'езду, у Берасьце былі затрыманыя 11 дэлегатаў, якія накіроўваліся на мерапрыемства.

Адміністрацыя Менскага міжнароднага адукацыйнага цэнтру IBB выдзеліла памяшканьне для правядзеньне вялізнага форуму грамадзкіх аб'яднаньняў - шостай Асамблеі няўрадавых арганізацыяў і ініцыятываў (6-7 сакавіка). Аднак як і ў выпадку з Партыяй БХД, правядзеньне падрыхтоўчых мерапрыесмтваў да гэтага сходу ў правінцыі сутыкнулася з цяжкасьцямі. Так, Гомельскі абласны выканаўчы камітэт ня даў дазволу на правядзеньне сходу грамадзкіх арганізацыяў і ініцыятыў Гомельскай вобласьці. Як паведаміў намесьнік старшыні гомельскага гарадзкога аддзяленьня беларускага рэспубліканскага аб'яднаньня "Прававая ініцыятыва" Уладзімер Кацора, сход грамадзкіх аб'яднаньняў і ініцыятыў плянавалася правесьці ў Доме творчасьці дзяцей і моладзі "Юнацтва". Была дасягнутая папярэдняя вусная дамова з дырэктарам Дому творчасьці аб арэндзе памяшканьня. Дом творчасьці належыць упраўленьню культуры аблвыканкама. Таму, каб атрымаць афіцыйны дазвол на арганізацыю мерапрыемства ў гэтым памяшканьні, Уладзімер Кацора зьвярнуўся да намесьніка старшыні аблвыканкама па ідэалёгіі Кірычэнкі. Праз некаторы час з Кацорам праз тэлефон зьвязаўся дырэктар Дома творчасьці дзяцей і моладзі "Юнацтва", які сказаў, што не можа прадаставіць памяшканьне. Прычыны адмовы ён не назваў, спаслаўшыся на тое, што гэта "не тэлефонная размова".